КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Пра людзей добрых

Васіль ТКАЧОЎ

**Гомельскія літаратары актыўна рыхтуюцца да свята беларускага пісьменства, якое сёлета, як вядома, пройдзе 4 верасня ў Рагачове. Іх творы друкуюцца ў часопісах і газетах, у калектыўных зборніках, выходзяць асобнымі кнігамі. Не засталася ў баку ад гэтага мерапрыемства і Ганна Атрошчанка, якая прэзентавала нядаўна сваю новую кнігу «Тоцька», куды ўвайшлі невялічкая аповесць, апавяданні, замалёўкі і публіцыстычныя артыкулы. І хоць мы ведаем гэтую аўтарку як прызнаную паэтэсу, на гэты раз яна прапанавала мінскаму выдавецтву «Каўчэг» толькі тыя творы, пра якія я згадаў вышэй.**

Для тых, хто, магчыма, мала знаёмы з творчасцю Ганны Атрошчанкі, нагадаю, што яна нарадзілася ў Добрушскім раёне, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў, у свой час выдала кнігі паэзіі і прозы «Арыёза жыцця», «Летуценніца», «Кроза», «Сустрэча», «Ветрагон», «Прыгоды жабрачкі», «Ларысkіны ўспамінкі» і іншыя. Многія вершы сталі песнямі і рамансамі, перакладзены на рускую і ўкраінскую мовы, гучалі па абласному і рэспубліканскаму радыё.

Аўтар, як бачым, надзвычай актыўны, пладавіты. Не пакіне раўнадушным чытача і новая кніга Ганны Атрошчанкі «Тоцька». Назву ёй дала, дарэчы, аднайменная аповесць. Яна – пра няпросты лёс беларускай жанчыны, на долю якой выпалі суровыя жыццёвыя выпрабаванні. Вайна, голад і холад – праз усё прайшла Тацццяна, альбо Тоцька, як звалі яе вяскоўцы, аднак не страціла сваёй чалавечай годнасці, веры ў лепшае жыццё, якое і набліжала сваімі добрымі справамі.

Запамінаюцца апавяданні «Свяча», «Афрыка на галаве», «Свінапас», «Народны звычай не падвёў», «Першы ўрок», «Помста пастуха» і некаторыя іншыя.

Асобна хочацца спыніцца на раздзеле «Публіцыстыка». Ганна Атрошчанка апавядае пра літаратурныя стасункі гомельскіх і расійскіх пісьменнікаў, у прыватнасці, пра паездку ў Таганрог, пра сустрэчы там з чытачамі. Асобныя старонкі кнігі прысвечаны сябрам-літаратарам Аляксандру Атрушкевічу, Лідзіі Возісавай, Галіне Рагавой, Лідзіі Долбікавай. Згадвае яна Івана Кірэйчыка, паэта і нарысіста, які ўжо, на вялікі жаль, пакінуў гэты свет, але многім запомніўся як надта цікавы аўтар і своеасаблівы




чалавек. Няма ўжо і салісткі Гомельскай філармоніі Тамары Сапегінай. Але памяць пра яе, як і пра Івана Кірэйчыка, жыве ў сэрцах тых, хто іх ведаў. Пахвальна, што далучылася да захоўвання гэтай памяці і пісьменніца з Гомеля Ганна Атрошчанка, прысвяціўшы ім старонкі новай кнігі, якая, несумненна, знойдзе свайго чытача.

Прадмову ж да кнігі «Тоцька» напісала загадчыца аддзела абслугоўвання 1–5 класаў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна Наталля Нікіціна і назвала пераканаўча і проста: «Добрым людзям – светлы шлях!» Менавіта пра людзей добрых і апавядае нам Ганна Атрошчанка.

СОТРУДНИЧЕСТВО

# Книги от русского зарубежья

Дмитрий ЧЕРНЯВСКИЙ, «ГВ»

**300 изданий по истории русского зарубежья, искусству и литературе передало Сети публичных библиотек города Гомеля Государственное бюджетное учреждение культуры города Москвы «Дом русского зарубежья имени Александра Солженицына» при содействии исполняющей обязанности руководителя представительства Россотрудничества в Беларуси Виктора Мичурина.**




Фото Дмитрия ЧЕРНЯВСКОГО, «ГВ»

«Дом русского зарубежья имени Александра Солженицына» – это уникальный комплекс, формирующий фонд памятников духовной и материальной культуры эмиграции, органично сочетающий функции музея, архива, библиотеки, научно-исследовательского, информационно-издательского и культурно-просветительского центра. Это единственное в своём роде учреждение, деятельность которого всецело посвящена историческому феномену русского зарубежья, а также развитию отношений и укреплению связей с соотечественниками за пределами России.

– У нашего учреждения большая программа книжной помощи. Мы уже передали 10 регионам России и 40 зарубежным странам большие книжные собрания, – подчеркнул главный библиограф учреждения «Дома русского зарубежья имени Александра Солженицына» Виктор Леонидов. – Мы в седьмой раз приехали в Беларусь, чтобы презентовать в дар литературу высокого уровня. Это эмигрантская проза, научные издания, исследующие творчество Александра Пушкина, Анны Ахматовой, Марины Цветаевой, богословские сочинения и роскошные альбомы по истории искусства. Уверен, что гомельчанам, интересующимся философией, историей и литературой, будут интересны подаренные нами книги.

Также во время презентации изданий зрителям продемонстрировали фильм о деятельности центра и представили концертную программу, подготовленную гостями из Москвы.

ПРЕМИИ

# Мастерам слова

**Завершается приём произведений на соискание литературной премии имени Кирилла Туровского.**

Премия, учреждённая в 2013 году Гомельским облисполкомом, призвана способствовать созданию писателями Гомельщины высокохудожественных произведений, выявлению знаковых имён в сфере словесного искусства.

Присуждается премия ежегодно на конкурсной основе в шести номинациях: «Проза», «Поэзия», «Драматургия», «Детская литература», «Публицистика и литературная критика», «Открытие».

Материалы по выдвижению литературных трудов, включающие заявку, электронный вариант произведения, оцифрованные публикации и копии статей, авторам следует высылать по 30 мая 2016 года на электронный адрес: k.turovski.premiya2013@yandex.by.

Подробно с правилами оформления заявок, требованиями к выдвигаемым на соискание премии произведениям и другими нюансами конкурса литераторы могут ознакомиться на сайте «Культура Гомельщины»: www.gomeloblkultura.by.

Подготовила Елена ФЁДОРОВА, «ГВ»

